

# МЕТОДЫКА І ВОПЫТ

*Па новых падручніках*

Ірына ГОЎЗІЧ

## "КАЛІ МАЎЧЫЦЬ ДУША, ГІБЕЕ РОЗУМ НАШ..."

### ВЫВУЧЭННЕ ТВОРАЎ МІХАСЯ СТРАЛЬЦОВА Ў СТАРЭЙШЫХ КЛАСАХ

Міхась Стральцоў адносіцца да пакалення "дзяцей вайны", якое "вырасла пад гарматнымі ствaламі". Яшчэ гэтае пакаленне называюць пакаленнем бязбацькавічаў, філалагічным, шасцідзесятнікаў. Многія яго прадстаўнікі загінулі ці ў трывожныя ваенныя, ці ў галодныя пасляваенныя гады. Той, хто ацалеў, змог пазней шчыра, адкрыта, даверліва, з мяккай пяшчотай і светлым сумам расказаць пра перажытае. Міхась Стральцоў, як і яго равеснікі — Рыгор Барадулін (з якім сябраваў, якому прысвяціў не адзін твор), Уладзімір Караткевіч, Анатоль Вярцінскі, Генадзь Бураўкін, Іван Чыгрынаў, Барыс Сачанка, Іван Пташнікаў, Сцяпан Гаўрусёў і іншыя, жыў памяццю пра ваенныя падзеі, надзеяй на лепшае жыццё ў час хрушчоўскай "адлігі", шанаваў родныя вясковыя звычаі, адначасова пацiху прызвычайваўся да гарадскога жыцця. Яго празаічныя, паэтычныя і крытычныя творы насычаны празрыста-светлым і сумна-трывожным лірызмам, гэта светлы сум звычайнага, простага чалавека, які не кіруецца формулай "жыць — як набяжыць", а па-філасофску глыбока, удумліва і засяроджана ацэньвае сваю ролю ў гістарычным працэсе, суадносіць малое, прыватнае з глабальным і вялікім; пастаянна паглыбляецца ў свет асабістых перажыванняў, аналізуе стан душы лірычнага героя. Міхась Стральцоў — адначасова і лірык, і філосаф, і псіхолаг, вельмі блізкі ў апавяданнях да Кузьмы Чорнага.

#### КАРОТКІЯ ЗВЕСТКІ ПРА ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ

Міхаіл Лявонавіч Стральцоў нарадзіўся 14 лютага 1937 г. у вёсцы Сычын Слаўгарадскага раёна. Бацька – Лявон Клімавіч – быў дырэктарам школы, а маці – Марына Міхайлаўна – займалася хатняй гаспадаркай. У 1954 г. будучы пісьменнік закончыў Нова-Ельненскую сярэднюю школу і паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пасля заканчэння навучання працаваў у газеце "Літаратура і Мастацтва" (1959 – 1961, 1969 – 1972), часопісах "Полымя" (1961 – 1962), "Маладосць" (1962 – 1968), загадчыкам аддзела ў часопісе "Нёман" (з 1984 г.).



*Ірына Мікалаеўна Гоўзіч — даследчык літаратуры. Кандыдат філалагічных навук (2004). Закончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка (1997). Старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі літаратурнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

Пра сваё дзяцінства і дзяцінства аднагодкаў-раўеснікаў паэт згадвае і ў апавяданнях, і ў вершах, і ў крытычных артыкулах, напісаных у форме эсэ (паіншаму, вольных разважанняў). Адно з эсэ называецца "Дзяцінства, якое мы помнім" (1984). Гэта твор пра пакаленне, якое рана пасталела, бо перажыло і смерць блізкіх і родных, і пасляваенны голад, бо навучылася, пераадольваючы цяжкасці, цаніць жыццё, захоўваць памяць пра мінулае. Таму менавіта дзіцячыя гады сталі стартавай пляцоўкай далейшага жыцця пісьменніка і вызначылі агульны гуманістычны змест яго творчасці. Вось як апісаў Міхась Стральцоў жыццё і адзначыў творчае крэда (пазіцыю) прадстаўнікоў пакалення "дзяцей вайны": *«Мае аднагодкі належаць да пакалення, чыё дзяцінства пазначана ваеннай і пасляваеннай парой. Незабыўная і па-свойму шчаслівая пара, нягледзячы на тое, што яно помніць жахі вайны, ведае смерць блізкіх, ведае, што такое голад і нястача, ведае сіроцтва, але яно і шчаслівае веданнем высокай цаны самога жыцця, шчодрасці чалавечага сэрца, веданнем таго, што побыт, самы просты і бедны, не ганьбіць чалавека, а, як ні дзіўна, часта ўзвышае яго, адкрывае ў ім "душы залатыя россыпы", мужнасць, самаахвярнасць, прыгажосць учынку, спагадлівасць, дабрыню, адчуванне зітаванасці і еднасці з другімі людзьмі.*

*Што мы помнім? Смак "ташноцікаў" з гнілой, перамёрзлай бульбы, праснак з той жа бульбы і ячменных шароек, посную зацірку. Але мы помнім і як прыходзілі ў хату партызаны, пакідаючы такую дарагую на той час газету ці лістоўку. Па іх мы вучыліся чытаць.*

*На тых газетах ды лістоўках выводзілі мы потым свае першыя літары – чарнілам з конскага*

*шчаўя, са шкарлупак лясных арэхаў, з ліста ягады талакнянкі. <...>*

*Не скора, не адразу абазваўся ў нашай творчасці той ваенны і пасляваенны вопыт. Усведамленне важнасці яго расло разам з намі, з чалавечым і грамадзянскім пасталеннем. Так было з усімі пісьменнікамі майго пакалення. Ужо дарослымі мы па-сапраўднаму адчулі сябе дзецьмі вайны. І тады напісалася апавяданне "На чацвёртым годзе вайны", аповесць "Адзін лапаць, адзін чунь". Там – ураджанні ваеннага дзяцінства, першапачатковы, можа, самы галоўны жыццёвы вопыт. Эмацыянальны вопыт майго пакалення і пакалення, якое не ведала вайны, паяднаўся. Паяднаўся на разуменні той цаны, якую заплацілі мы за мір, засталася Памяць – у майго пакалення біяграфічная, у новага – гістарычная. Памяць з вялікай літары».*

## ПАЧАТАК ТВОРЧАСЦІ

Памяць пра вайну, "матчыну калыску", "бацькоўскі парог" (як і ў Р. Барадуліна) і родную вёску прадвызначае змест усёй творчасці Міхася Стральцова. Галоўным героем яго твораў стаў малады чалавек-аналітык, які хоча спазнаць сэнс жыцця, былы вясковец, які ўжываецца ў гарадскую стыхію, якога не пакідае абыякавым "сена на асфальце".

Навучанне ў БДУ, журналісцкая праца акрэслілі некаторыя тэмы і мастацкія інтарэсы пісьменніка. Ён пачаў пісаць апавяданні "Блакітны вецер" (Маладосць, 1957), "Долса", "Восеньскі ўспамін", "Двое ў лесе" і іншыя, якія выйшлі асобнай кніжкай **"Блакітны вецер"** у 1962 г. У іх вызначыліся такія рысы творчасці М. Стральцова, як ***лірызм, павышаная пачуццёвасць*** герояў і аўтара, ***асацыяцыйнасць вобразнасці, маналагічная спавядальнасць***.

Герой апавядання "Блакітны вецер" выкладчык ВНУ Лагацкі, былы вясковец, не можа заснуць, ідзе ў вандроўку па начным горадзе і мроіць пра загадкі жыцця ("дом без аблічча і нумара", маленства, студэнтаў, якія паводзяць сябе не так, як хацелася б, суседа па інтэрнаце Толіка, да якога не пайшоў на адыходную ў армію вечарыну). Як і герой твораў Кузьмы Чорнага, ён імкнецца зразумець і знайсці сваё месца ў жыцці, увабраць у сябе яго гукі, фарбы і на гэтым фоне распазнаць сябе, зразумець сваю сутнасць, ацаніць свае ўчынкі. І дапамагае яму ў гэтым блакітны вецер – сімвал нечага лагоднага, гарманічнага, пяшчотнага. Вецер, што застаўся ў свядомасці героя з дзяцінства, прымроіўся яму некалі, супакойвае, уздымае настрой, кліча да светлай мары. Вось як заканчваецца апавяданне: *«Ён нахіліўся і, узяўшы рукою і сціснуўшы ў далоні камячок снегу, прыклаў яго да твару. Прыемная і свежая заструменілася тады прахалода. Лагацкі выпрастаўся. "Трэба жыць, – падумаў ён, – трэба смялей і весялей жыць: пазбыцца раўнадушша, чэрствасці, замкнутасці ў сабе. І тады ніколі не пакіне мяне блакітны вецер"».*

У апавяданнях "Трыпціх", "Дома", "Перад дарогай", "На вакзале чакае аўтобус", больш познім, асабліва вылучаным крытыкамі "Смаленне кабана" раскрываецца галоўная тэма творчасці М. Стральцова – тэма духоўнай сувязі паміж горадам і вёскай, сувязі вясковых каранёў і гарадскога прагрэсу, празрыстасці расы на лістах дрэваў і блакітнага агеньчыка тэлеэкрана, грукату падводаў па асфальтаванай вуліцы, што вядзе на Конскі базар, і трамваяў. Пісьменнік прымае жыццё з яго вытокамі і працягам, з вясковымі хатамі і гарадскімі камяніцамі. *"Сяргей Марус, інжынер-планавік, неспадзявана адчуў, што яму нечага не хапае ў горадзе, які адразу здаўся сумным, нецікавым і пыльным. <...> Сяргей Марус зразумеў, што гэта была туга па вёсцы. Праз колькі дзён ён не вытрываў, узяў адпачынак і паехаў да бацькоў у далёкую Смолку"* – так пачынаецца апавяданне "Там, дзе зацішак, спакой". Сяргей пакідае горад у дажджлівае надвор'е, едзе цягніком, аўтобусам, пераязджае раку ў лодцы, ідзе ў начной цемры лугавінай, баравой сцежкай, каб нарэшце адчуць дома дотык на сваёй шчацэ бацькавай – *"шорсткай, няголенай"*, пацалаваць разгубленую ад шчасця маці, пачуць горкую навіну пра смерць хлопчыка – сына Платона Крывашэя ад стрэлу з абрэза, што захаваўся ад вайны, заснуць пад шум дажджу і шарахценне ветру ў ***матчынай хаце***. М. Стральцоў стварыў элегічны, сумны твор, паклаўшы ў яго аснову ўласныя перажыванні і пачуцці. Пісьменнік сам не адзін раз перажываў падобныя гісторыі, кідаючы гарадскі камфорт дзеля таго, каб наведаць сваю родную вясковую хату.

Гэтае і многія іншыя апавяданні напісаны ў форме ўнутранага маналогу ці самога аўтара, ці герояў, якім ён перадавярае думкі. Яны блізкія да лірыкі, таму і называюцца лірычнымі. У такіх творах сюжэт не цэласны, а эпізадычны, сцэны і падзеі працуюць на раскрыццё перажыванняў герояў ці апавядальніка.

Усімі адзначанымі рысамі характарызуецца і апавяданне "Двое ў лесе" (1960), у якім галоўны герой твора Васіль перажывае па страчаным па віне нязграбнага, але хітрага школьнага рахункавода Клыбіка каханні да настаўніцы Марыны. Прырода ў апавяданні надзвычай прыгожая і сакавітая: лес, якім захапляецца Васіль, ноч, калі ён праводзіць з танцаў Марыну. Васілёў настрой умела і дакладна "ўпісаны" ў навакольны прыродны і вясковы свет: *"Яшчэ бліжэй, пасярод баравіны,* ***спадзіна: цэлы статак серабрыстых асінак пасецца там****"; "Быццам нейкая* ***лёгкая і чыстая хваля*** *падхапіла і несла яго: і гэтая ноч, і высокі месяц над вёскай, і росны выган за вуліцай у такім* ***свежым і ядраным блеску*** *– усё здавалася Васілю новым, нібы ўбачаным упершыню. Яму хацелася сказаць Марыне, як ён разумее яе..."*.

За першым зборнікам апавяданняў выйшаў другі – **"Сена на асфальце"** (1966) з рамантычна-ўзнёслай, сімвалічнай назвай. Потым былі выдадзены аповесць **"Адзін лапаць, адзін чунь"** (1970), кніга прозы, што складаецца з апавяданняў і аповесці, **"Падарожжа за горад"**. У новых кнігах М. Стральцова таксама гучыць голас аўтара – сына вёскі, які імкнецца пры кожным зручным выпадку да вытокаў, каранёў, да прыгажосці нерушнага, спрадвечнага, гарманічнага, асвечанага векавымі традыцыямі народнага, бацькавага і матчынага жыцця.

## ПАЭЗІЯ: ПРАГА ДАБРА, СПРАВЯДЛІВАСЦІ, ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНЫЯ ПОШУКІ

Міхась Стральцоў з'яўляецца таксама аўтарам чатырох зборнікаў паэзіі: **"Ядлоўцавы куст"** (1973), **"Цень ад вясла"** (1979), **"Яшчэ і заўтра"** (1983), **"Мой свеце ясны"** (1986). Вершы, прадстаўленыя ў кнігах, напісаныя на тыя самыя тэмы, што і апавяданні, – пра мінулую вайну і пасляваеннае драматычнае жыццё, пра нялёгкае дзяцінства, бацькоўскі парог, родную прыроду, вясковы і гарадскі ўклад жыцця. Многа твораў прысвечана вечным тэмам: каханню, жыццю і смерці, спалучэнню прыватнага і агульнага, паэзіі, ролі мастака ў жыцці і творчасці. У жанравых адносінах – гэта пераважна элегіі, прасякнутыя настроем смутку, тугі, оды пра радасць быцця і прыгажосць прыроды, разважанні пра лёс чалавека, мінулае, сучаснае і будучыню, пасланні, звароты да сяброў, замалёўкі выпадкаў, сцэн, падзей. Паэтычным творам М. Стральцова ўласцівае спалучэнне апісальнасці і маналагічнасці, яркая метафарычнасць і вобразнасць. Паэт піша як метрычна традыцыйныя (сілаба-танічныя), так і свабодныя (верлібры) вершы. Часам у адным творы спалучаюцца адзнакі дзвюх вершаваных сістэм. Ёсць у паэта і творы песенныя, напеўна-фальклорныя. Вось некалькі радкоў з аднаго такога "Ты – сяло, і я – сяло...":

*Рассадзілі нас па лавах,*
*Злыбяда – на покуце.*
*Ты – са славай, я – з няславай –*
*Налучыць бы польку дзе?*

А вось прыклад філасофскага верша-разважання "Засцярога" – пра тое, што сапраўдная творчасць – гэта заўсёды вялікая душэўная самааддача, душэўнае гарэнне. Калі гэтага няма, мастаку лепш маўчаць:

*Калі маўчыць душа, гібее розум наш,*
*Як дрэва без вады ці як вятрак без ветру.*
*Жыццё лічы на дні альбо на кіламетры –*
*Вакол цябе адно панылы антураж.*
*І ўсё, што словам ты ні назавеш,*
*Маўчыць, як цішыня ці як вятрак без ветру,*
*І не даецца сэнс, нібы руцэ паветра.*
*Калі душа маўчыць, не гаварыце лепш.*

Твор напісаны ямбам у традыцыйным стылі, у ім вылучаны пры дапамозе паўтораў і параўнанняў цэнтральны вобраз: *"**маўчыць душа**... Як дрэва без вады ці як вятрак без ветру"*. Як кожны філасофскі твор-разважанне, верш заканчваецца афарыстычным, сэнсава значным радком: *"Калі душа маўчыць, не гаварыце лепш"*.

Глыбокім гуманістычным зместам напоўнены вершы паэта пра мінулае, дзяцінства, вёску і яе жыхароў, родныя краявіды і пра горад, які не такі ўжо і страшны для былога вяскоўца, пра што сведчыць наступная замалёўка вясковага вечара (верш "Вечаровае"), прыгажосць і гармонія якога "агучваюцца" ў канцы двума апошнімі радкамі:

*Брыду сцяжынкай каламутнай,*
*Заціўкам лазняў і стадол,*
*Бо захад **дымным перламутрам***
*Асыпаўся на **снежны дол**.*
*Аблёгся і **застыў вятрыска***
*У кажуховым каўняры.*
*Тапчу нагой **імглісты прысак***
*Вунь той **маліпавай зары**.*

***Як мары, белыя бярозы**...******
*Такая ціш! Чуваць здаля*
***Звон ад вядра і рып марозны***
*Бацькоўскай студні **жураўля**.*

Аўтарам перададзена не толькі колеравая палітра зімовага надвячорка (захад асыпаецца *дымным перламутрам на снежны дол*, зара – *малінавая*), але і рэзкія, вострыя гукі бацькоўскага калодзежнага жураўля. Апошнія два радкі змяшчаюць канцэнтраванае выказванне любові да роднага краю.

Паэт таксама пісаў верлібры і напалову верлібры ("Эпіграф", "Глухата", "Ты пайшла..." і інш.), якія часта заканчваюцца афарыстычнымі высновамі (*"Чую, у садзе чужым пяе, / Бачу між дрэў залачоную клетку"*). Пераважная большасць твораў Міхася Стральцова трымаецца на незвычайнай, нетрадыцыйнай, нечаканай вобразнасці: *"неба хмаркамі парасло, як травой"* ("Лета. Ноч"); *"у халадзільніка ёсць душа"*, *"у халадзільніка ёсць настрой"*, *"халадзільнік ля бока воркача, лагодна і мірна, як кот"* ("Халадзільнік"). Паэт выдатна валодае яскравым, сакаўным і трапным словам: *"мурчыць"*, *"аддарыць"*, *"гуркоўнік"*, *"смуглявае лета"*, *"у жыцці недазмагаўся"*, *"неспазнаненькі"*.

## ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА: АДМЕТНАСЦЬ, СВОЕАСАБЛІВАСЦЬ, СУЧАСНАСЦЬ АЦЭНАК ТВОРЧАСЦІ МАСТАКОЎ СЛОВА

Акрамя таго, што Міхась Стральцоў пісаў празаічныя і паэтычныя творы, ён быў арыгінальным даследчыкам літаратуры і крытыкам. Артыкулы і рэцэнзіі ён пісаў свабодна, даваў суб'ектыўныя ацэнкі літаратурным з'явам, многія з якіх не страцілі значэння і актуальнасці і сёння. Па жанры гэта былі літаратурна-крытычныя артыкулы і эсэ. Усяго было выдадзена чатыры кнігі падобных твораў: **"Жыццё ў слове"** (1965), **"Загадка Багдановіча"** (1968), **"У полі зроку"** (1976) і **"Пячатка майстра"** (1986). Артыкулы пісьменнік пісаў у час хрушчоўскай "адлігі", калі грамадства пазбаўлялася наступстваў уплыву культу асобы Сталіна на жыццё, людзі адчулі смак свабоды, зацікавіліся будучыняй краіны, а моладзь паехала асвойваць цаліннія землі, пакараць Ангару.

Артыкулы і эсэ М. Стральцова прысвечаны класікам нашай літаратуры Францішку Багушэвічу ("Дудар беларускі"), Янку Купалу ("На пачатку ўсіх пачаткаў"), Якубу Коласу ("Ад роднай зямлі"), Кузьме Чорнаму ("Шырокасць"), Максіму Гарэцкаму ("Чалавек з Малой Багацькаўкі"), Змітраку Бядулю ("З пляяды першых"). Ён высока ацэньваў творчасць Я. Брыля ("Слова ўдзячнасці", "Служэнне"), А. Блока ("Не іначай як подзвіг душы"), А. Пысіна ("Часоў былых і новых сувязь"), П. Панчанкі ("Разам з людзьмі"),

* Радок запазычаны, вылучаны М. Стральцовым.

Р. Барадуліна, В. Карамазава, А. Кудраўца і іншых пісьменнікаў.

У артыкулах М. Стральцоў закранаў наступныя складаныя праблемы: суадносіны мастацтва і жыцця, эстэтычнага і грамадска-сацыяльнага, узаемаадносіны мастака і грамадства, сутнасць трагічнага і камічнага. Да сённяшняга часу не зменшылася значэнне яго ацэнкі ролі Максіма Багдановіча ў літаратурным працэсе Беларусі, у паскарэнні нацыянальнага адраджэння: *"Багдановіч чуйна, як ніхто, успрыняў і адгукнуўся на новы сацыяльны заказ, ён адчуў, што гісторыя неўзабаве напіша самыя трагічныя і тым часам гераічныя старонкі ў лёсе роднага краю, што наперадзе новы ўздым нацыянальнай самасвядомасці. Ён выконваў заказ часу"*.

А вось як вобразна і надзвычай сучасна гучаць радкі М. Стральцова з артыкула "На пачатку ўсіх пачаткаў" пра "зорны гадзіннік" нашай літаратуры, пачатак якому паклалі першыя публікацыі Янкі Купалы шасцідзесяцігадовай даўнасці (артыкул датуецца 1964 г.): *"Гадзіннік нашай новай літаратуры сёлета паказвае шэсцьдзесят год, лічачы час ад таго дня, калі ўпершыню абазваўся на роднай мове нікому яшчэ не вядомы Янка Купала... за гэтай, на шчасце, першай велічыні зоркай, узышла другая, трэцяя – то былі зоркі Коласа і Багдановіча. <...> ...гэта было сузор'е. Зорны гадзіннік пачаў паказваць час"*.

Пішучы пра М. Гарэцкага, яго "Сібірскія абразкі", крытык вызначыў іх жанравую адметнасць – эсэ, прызнаўся, што любіць прозу гэтага майстра *"За пульсаванне фразы, непадобнае і натуральнае, як дыханне"*, за аўтарскае "я", што выяўляецца ў ёй, – "не ўмоўна – літаратурнае, хадульнае", а *«жывое, уроўненае ўсім чалавечым з людзьмі "Я"»*. Гэтая ацэнка не страціла арыгінальнасці і сёння.

Нібы прадказваючы развaжанні сучасных літаратуразнаўцаў пра ўзаемадзеянне эпічнага і лірычнага родаў літаратуры, таленавіты крытык пісаў у артыкуле "Слова ўдзячнасці" (1967) пра Я. Брыля: *"Рэальнасць, з якой мае справу лірык, настолькі ж аб'ектыўная, як і тая, з якой мае справу эпік. <...> І вось што важна: лірык... не зводзіць жыццё... толькі да выбранага адзінства сувязей, якімі мнагастайнымі яны б ні былі. Арганізаваны кавалак рэальнасці, гэтую цяпер ужо мастацкую дадзенасць, лірык імкнецца ўпісаць у шырокую, найшырэйшую... раму жыцця; у дыханні гэтага, касмічна ўсеабдымнага, жыцця, у свядомай супастаўленасці з ім – эпічны пафас неэпічнай канцэпцыі лірыкаў"*.

Вельмі трапна М. Стральцоў выказаў разуменне прызначэння мастака, якім кіруецца сучаснае мастацтва слова: *«Варта шанаваць грамадзянскасць і грамадзянскую смеласць заўсёды і паўсюль і быць удзячнымі таму, хто скажа сваё "не магу маўчаць", калі з'явіцца ў яго патрэба ў гэтым. <...> Аднак не забудзем разам з тым і пра мастацтва, пра тое высокае мастацтва, якое не бывае ні бессэнсоўным, ні вычварным у светлым вобразе сваім...»*.

Міхась Стральцоў быў таксама і таленавітым перакладчыкам, загучалі на беларускай мове раман Ч. Айтматава "Буранны паўстанак" (1987), асобныя творы рускіх, украінскіх, італьянскіх, лацінаамерыканскіх паэтаў. У 1986 г. ён уганараваны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі за кнігу вершаў **"Мой свеце ясны"**.

## "СЕНА НА АСФАЛЬЦЕ"

### Час напісання. Тэматыка, ідэйны пафас

Апавяданне Міхася Стральцова "Сена на асфальце" было напісана ў 1963 г., упершыню апублікаванае ў часопісе "Маладосць" і дало назву другой кнізе апавяданняў пісьменніка, якая з'явілася ў 1967 г. Твор складаецца з некалькіх частак, працягвае і развівае тэму ранейшых апавяданняў ("Восеньскі ўспамін", "Двое ў лесе", "Блакітны вецер" і інш.). У "Сене на асфальце" пісьменнік закранае не толькі тэму "вёска – горад", "вясковае – гарадское", але і шмат іншых, у першую чаргу маральна-этычных. Гэта і тэма кахання ("Ліст першы"), і тэма вясковага побыту на гарадской ускраіне ("Дзядзька Ігнат") з яго паўсядзённымі клопатамі і размовамі пра надвор'е, пра чарговы футбольны матч, пра палітычныя падзеі, і тэма недалёкага ваеннага і пасляваеннага мінулага. З болем паведамляе апавядальніку гэты сталы чалавек пра ваенныя страты (*"Такую вайну на плячах вынеслі, столькі пакінулі сірот, матак няўцешных і ўдоў. Столькі аратаяў, цесляў на той вайне палягло..."*), пра беднае пасляваеннае існаванне, калі ўдовы давалі хабар за каня, каб прывезці дроў, брыгадзіру, самі аралі гародчыкі, ставячы "карову ў плуг", "дровы з лесу на саначках" вазілі і кожны дзень летам ішлі на працу. У вусны дзядзькі Ігната ўкладзены балючыя словы пра дабро і зло, пра тых брыгадзіраў, старшыняў і "падстаршынкаў", *"што на людскім горы падчаровак гадавалі"*, на *"ўдовіных слёзах"*. Яго і з брыгадзірства знялі за барацьбу з адным з такіх "слуг народа" – фінінспектарам Куфрам (лазіў па куфрах, спаганяючы падатак, таму такую мянушку далі яму людзі): *"набіў таму гаду тоўстую морду"*, заступаючыся за бедную ўдаву – суседку Арыну.

У трэцяй, надзвычай лірычнай частцы апавядання "Ліст другі" галоўная тэма – сяброўства, вернасць школьнаму пабрацімству, традыцыям сумленнага жыцця, што заклала ў сэрца і душу вясковая пачатковая школка, якая мясцілася ў хаце цёткі Аўгінні (*"старой, без гародчыка пад вокнамі"*, з вокнамі на вуліцу і *"шырокім мурожным дваром"*). Віктар заклікае сябра прайсціся туды, *"на парог сваёй першай навукі"*, хоць хаты даўно няма, вярнуцца ў мінулае, каб паслухаць школьны званок, *"зроблены з шурпатай снараднай галоўкі"*. Яму так хочацца пакланіцца *"невядомай магіле"* бацькі (які загінуў без вестак). Побач з тэмай сяброўства ў гэтым лісце гучыць тэма вернасці вытокам, хатцы-школцы, матчынаму плачу пры чытанні абвесткі пра бацьку, дасланай з ваенкамата. Закранаецца тут таксама (праўда, вельмі лаканічна) і тэма выкрыцця культу асобы Сталіна (*"І недзе там, далёка, быў чалавек, якому мы верылі больш, чым сабе. Цяпер мы ўжо не верым*

*таму чалавеку. Ды яго ўжо і няма. Патроху ды памалу вучыліся мы ва ўсім пакладацца на саміх сябе"*). "Ліст другі" гучыць як клятва, як прысяга сумленню, шчырасці, дружбе. Ён з'яўляецца своеасаблівым вершам у прозе, споведдзю чалавека, які навучыўся любіць жыццё, цаніць сяброўства, вернасць і заклікае да гэтага нас, чытачоў.

Тэма "горад – вёска" разам з тэмай кахання выразна раскрываецца ў чацвёртай частцы апавядання "З а ў т р а  ф у т б о л" праз апісанне гарадскога жыцця ў яркіх дэталях: ідзе дождж, як прадказваў дзядзька Ігнат; людзі вяртаюцца дадому (*"на матацыклах, матаролерах, у легкавушках"*); тэатральная рэклама, купкі святочна апранутай моладзі каля кавярні; міліцыя сочыць за захаваннем правілаў дарожнага руху. Адлюстраванне побыту паступова саступае месца ўнутранаму маналогу героя пра трывогі (як прымірыць горад і вёску) і радасці (думкі пра Лену, пра тое, як назаўтра яны да футбола паедуць на возера, будуць купацца, радавацца жыццю). Віктар разважае над словамі дзядзькі Ігната пра вёску, шануе яго меркаванне, але імкнецца знайсці больш правільнае вырашэнне праблемы. Ён вагаецца ў выбары пазіцыі. Складаная барацьба ідзе ў свядомасці галоўнага героя: *"Я думаў пра дзядзьку Ігната, пра яго дзіўную і такую зразумелую любоў да вёскі, і мне чамусьці было трошкі шкада яго. <...> Мне хацелася, даўно хацелася прымірыць горад і вёску ў сваёй душы, і гэта была мая самая патаемная і самая душэўная думка. А можа, праўда дзядзькі Ігната, і чалавеку па-сапраўднаму трэба што-небудзь адно:* ***горад ці вёска, месяц над хатай ці электрычны ліхтар****"*. Гэтыя словы, як і наступныя, раскрываюць ідэю твора: неабходнасць прымірэння двух пачаткаў, паяднання вясковага (традыцыйнага) і гарадскога (новага, тэхнічна прагрэсіўнага) укладаў жыцця. Заканчваецца роздум галоўнага героя высновай – *"навошта выбіраць паміж жаваранкам і рэактыўным самалётам? Хіба ж нельга, каб было і тое і другое? <...> Не, я не дакараў дзядзьку Ігната. Я думаў, што* ***кожны чалавек павінен добра ведаць сваё месца на зямлі****, што кожны, урэшце, мае права любіць нешта асабліва моцна, – няхай так: гэта ўсё ж лепш, чым не любіць нічога"*. Да гэтай думкі прыйшоў герой твора, які, узняўшыся ў неба на самалёце, адчуў, што там, *"дзе душы кранаецца вечнасць, не існуе мяжы паміж жыццём і смерцю..."*, што ў чалавеку суіснуюць *туга на небе і па зямлі*, што прыходзяць гадзіны, калі *"спеў жаваранка аглушае нас не меней, чым гул рэактыўнага самалёта"*.

Наступная частка "Л і с т  т р э ц і" адлюстроўвае разважанні дзядзькі Ігната. Ён піша простай мовай радкі родзічам Андрэю і Куліне пра сваё жыццё (*"...мы жывыя і здаровыя, чаго і вам жадаем"*; *"...быў тут Піліпаў хлапечык у нас. Такі дзівак, грошы, яшчэ студэнтам пазычаныя, прынёс"*). У лісце раскрываецца ***характар дзядзькі Ігната***, духоўны склад вяскоўца, які не можа жыць у горадзе, якога прыцягвае вёска, нібыта магніт. Галоўная тэма апавядання тут раскрываецца праз яго думкі, перажыванні, выказаныя па-простаму, лаканічна, дасціпна. Мы даведваемся, што яму ў горадзе няўтульна і нязвыкла, ён дакарае сябе, што пазбавіўся хаты (*"...дык і кажу сабе: дурны ты, дурны, чаго ты са свайго гнязда сарваўся, чаго пайшоў у белы свет як у капейку!"*). Дзядзька Ігнат ужо падрыхтаваны да пераезду: *"Грошай трохі мы сабралі; каб купіць халупу, хопіць, а там, як кажуць, бог бацька; рукі ёсць, горб таксама, можна і новую хату паставіць"*. Менавіта праз падобны прыём самараскрыцця паказваецца псіхалогія чалавека, які мае свой стрыжань, які адданы вясковым караням: герой паказвае сваю любоў да роднага гняздоўя, гаспадарлівасць (грошай скапілі на хату), працавітасць (хоча жыць у вёсцы і працаваць лесніком), руплівасць і абачлівасць (перажывае, што як паставілі ў вёсцы пілараму, *"то многа лесу без пары і толку на глум ідзе"*). Пісьменнік адлюстроўвае стыхію народнай мовы, перадае асаблівасці гаворкі Ігната, перасыпанай прастамоўямі і афарызмамі: "белы свет", "халупа", "рукі ёсць, горб таксама", "чалавек харошы", "калі што якое", "на глум ідзе", "без пары".

"П а р а  к а с а в і ц ы" – фінал аповесці пра прыгажосць, гармонію жыцця, фізічную працу, якая прыносіць асалоду; касьбу травы на газонах у горадзе. Апавяданне вядзецца спачатку ў двух планах: вясковая раніца – раніца ў горадзе, у якіх шмат падабенства (*"Яшчэ не хадзілі трамваі, тралейбусы, вуліца была пустая і мокрая ад дажджу. Недзе за горадам узыходзіла сонца" – "Далёка-далёка, у маёй і ў дзядзькі Ігнатавай вёсках, пастух выганяў наранкі кароў"*). Потым паказваецца, як ідуць па горадзе касцы – дзядзька Ігнат і апавядальнік, як яны рыхтуюцца да касьбы, нібыта да нейкай магічнай, святочнай дзеі: *"– Пачынай, – сказаў дзядзька Ігнат... – Давай пакуль перакурым. –* ***І асцярожна палажыў касу*** *на шызую, набрынялую холадам елачку. – Пачынаць буду першы я...*

***Ён гаварыў ціха****. Раніцай нельга моцна гаварыць.* ***Я маўчаў****"*.

Цэнтральная сцэна апошняй часткі твора – праца, касьба, ад якой *"пасвятлеў увесь"* дзядзька Ігнат, якая нагадвала вёску, родныя лугі, тое, што было так нядаўна на волі, на шырокіх прасторах: *"Джгінь-джгінь-шах! Джгінь-джгінь-шах!*

***Вясёлая, харошая****, знаёмая з маленства* ***музыка****!"*

Пазней, ужо едучы на футбол, апавядальнік (Віктар) выскачыць на плошчы з тралейбуса, убачыць плён сваёй працы, яе вынікі, пачуе пах скошанай травы: *"Пякло сонца. Трава ў пракосах завяла. Па пракосах чорныя, аж бліскучыя, жвава скакалі шпакі. Пахла сенам.* ***Вялізны і шумны ляжаў*** *навокал* ***горад****. На плошчы* ***па-лугавому, палетняму пахла сенам****"*. Клок растрэсенага сена ляжаў і на тратуары. Герой узрушаны, бо знайшоў назву ўсяму, што перажывае сам, вясковец, што больш востра перажывае дзядзька Ігнат, – **радасць ад таго, што вёска засталася** сваёй маленькай **часцінкай у горадзе**, нагадала яму, вялізнаму і шумнаму, пра сябе: *"****Сена на асфальце****, – узрадавана думаў я. –* ***Вёска ў горадзе****"...*

Такім чынам, з апісання жыцця розных людзей, з мноства сцэн і эпізодаў вынікае ***гуманістычны змест твора***: аўтар заклікае любіць і вёску, і горад, шанаваць традыцыі, у першую чаргу – пава-

гу да працы, дабрыню, якія спрадвеку выхоўвала ў людзях вёска. “Сена на асфальце” – гэта сімвалічны вобраз, які заклікае помніць і тварыць дабро, жыць па-чалавечы адкрыта і светла. Сена на асфальце – гэта напамінак нам усім пра роднае вясковае, агульначалавечае карэнне.

**Герой-апавядальнік, дзядзька Ігнат, іншыя героі твора**

***Віктар*** – апавядальнік, герой твора – аспірант, былы студэнт, сын вёскі. Ён стараецца прымірыць горад з вёскай, шукае душэўны супакой. Ён кажа пра гэта дзядзьку Ігнату пры іх першай сустрэчы ў эсэ “Дзядзька Ігнат”: *“Я ведаю, што без вёскі нельга, але і без горада нельга таксама. Што я думаю, дык гэта – каб тое і другое ў чалавечай душы прымірыць...”* Малады чалавек імкнецца знайсці для сябе такое прымірэнне. Таму ён успамінае палёт на самалёце, высокае неба, у якое не ўзняўся б без тэхнікі, і ставіць побач жаўрука і рэактыўны лайнер, зямлю і неба. Віктару нялёгка знайсці адказ на пытанне, як прыдбаць душэўную раўнавагу і супакой. Ён хвалюецца, перажывае, калі бачыць растрэсены клок сена на асфальце. Яму хочацца стаць гарадскім жыхаром, пазбавіцца мрояў пра бацькоўскі парог, але ён не можа зрабіць гэтага рэзка і адразу. Магчыма, у адчуванні вясковых каранёў, любові да зямлі, да працы і ёсць яго ратунак? Задумаемся над пытаннем. Нам дапаможа на яго адказаць заключная частка твора “Пара касавіцы”. Дастаткова прачытаць радкі пра тое, з якім энтузіязмам ён робіць звыклую справу. Менавіта любоў да вясковых каранёў, разважлівая гаспадарлівасць прымусілі Віктара выйсці на плошчы і пабачыць вынікі сваёй і дзядзькі Ігната працы.

Віктар сціплы па характары (не пярэчыць дзядзьку Ігнату ні ў чым). Яго каханне да Лены цнатлівае і сарамлівае, ***ужо не вясковае***, пра якое яму апавядае дзядзька Ігнат. Ён працавіты, акуратны ў справах. Такія якасці яму падаравала ў большай ступені вёска. Хлопец уражлівы, лірык у душы. Гэты вобраз і аўтабіяграфічны, і тыповы: дзеці вайны былі менавіта такімі.

***Дзядзька Ігнат*** шмат у чым падобны да Віктара. Аднак ён больш сталы і вопытны чалавек, які пражыў сумленнае жыццё. Дзядзька Ігнат і жыў бы далей у вёсцы, толькі выпадак (заступніцтва за ўдаву – суседку Арынку) разлучыў яго з ёю на час. Але ён вернецца ў роднае гняздо, як відаць з “Ліста трэцяга”, каб зноў працаваць на зямлі, у лесе, будзе клапаціцца пра парадак, каб дарэмна не псавалі дрэва на лесапільні. Ён мудры дарадца, які любіць перадаваць свой вопыт маладзейшым (сцэна касьбы на газонах, сцэна з чалавекам у піжаме, які палівае кветнік, хоць заўтра, як кажа Ігнат, будзе дождж). Ігнат – выхавальнік не толькі словам, але і справай: ён паказвае Віктару прыклад у час працы. Гэты чалавек па-вясковаму абагаўляе працу і робіць яе, нібы выконвае святочны рытуал. Справядлівасць, сумленнасць – вось асноўныя прынцыпы жыцця героя. Сведчаннем таму – яго маналогі пра працу брыгадзірам пасля вайны. У душы дзядзька Ігнат – паэт і лірык. Можа, таму яму не сядзіцца, не жывецца спакойна ў горадзе.

Эпізадычныя героі ў творы: ***безыменны чалавек у піжаме***, які раіць Ігнату вярнуцца ў вёску, адчувае боль ягонай душы; Ігнатава жонка, якая бясконца ўгаворвае яго пакінуць горад; ***сябра Віктара***. Не мае знешняга аблічча, не раскрываецца душэўна ***Лена*** – каханая Віктара. Адмоўны персанаж – ***п’яніца-фінінспектар***, празваны Куфрам, які выконваў дырэктывы, адбіраў апошняе ў галодных людзей у якасці падатку.

**Кампазіцыя твора. Лірызм як яго стылёвая адметнасць**

Твор з’яўляецца арыгінальным па кампазіцыі: ён складаецца з шасці частак – “Ліст першы”, “Дзядзька Ігнат”, “Ліст другі”, “Заўтра футбол”, “Ліст трэці” і “Пара касавіцы”. Кожная частка не зусім самастойная: у ёй характарызуюцца галоўныя героі, паказваюцца сцэны з іх жыцця. Пісьменнік удала карыстаецца эпісталярным жанрам (жанрам пісьма), што дапамагае яму раскрыць герояў быццам знутры, дазваляе ім выказацца пра сябе і пра ўвесь свет, ахарактарызаваць іншых удзельнікаў падзей.

Лісты і іншыя часткі твора – пераважна лірызаваныя маналогі, у якіх раскрываюцца не толькі думкі, але і пачуцці і перажыванні герояў. Толькі ў эцюдзе “Дзядзька Ігнат” пераважае дыялогавая форма падачы матэрыялу. Кампазіцыйна твор блізкі да рамана “Герой нашага часу” Міхаіла Лермантава. Аўтар усебакова паказвае падзеі і іх удзельнікаў праз успрыманне розных людзей.

Самыя лірычныя часткі апавядання – пейзажныя замалёўкі – сакаўныя, яскравыя, светлыя, вясковыя і гарадскія.

## “НА ЧАЦВЁРТЫМ ГОДЗЕ ВАЙНЫ”

**Пасляваеннае жыццё, гора і нястачы, якія перажывае сялянская сям’я. Праўдзівасць побыту, дэталяў**

Апавяданне “На чацвёртым годзе вайны” датуецца 1964 годам. На гэты час ужо былі напісаны многія творы пра пасляваеннае ліхалецце, пра аднаўленне гаспадаркі на голым месцы, у якіх разгортваюцца драматычныя падзеі. Да найлепшых твораў пра мінулае ліхалецце адносіцца і апавяданне М. Стральцова, нягледзячы на просты пабытавы сюжэт...

У вясковай сям’і, якая страціла кармільца на вайне, адбываецца, здаецца, нявартая ўвагі падзея: свякроў – *“бабуля, высахлая, з учарнелым ад работы і старасці тварам”* – *“адсцябала матузамі малога ўнука за тое, што паабшчыпаў, не дачакаўшыся вячэры, акрайчык ацеслівага*, спечанага з бульбы і ячменных шароек** хлеба”*. Малы не заплакаў, але толькі *“не сваім голасам войкнуў”*, глядзеў на маці, як бы прасіў літасці і спагады, маліў заступіцца, потым уцёк на вуліцу і толькі там заплакаў. Маці ў гэты момант таўкла ў ступе проса. Так пачынаецца завязка сюжэта, дзеянне. Пачынаецца вялікая бяда ў сям’і, дзе галодна і малому, і старой, і яе нявестцы. Падзей і далей у творы будзе няшмат: пасля пакарання ўнука старая ідзе на двор, шпыняе ***худога,***

* Ацесліві – сыраваты, кіслы, глеўкі хлеб.

** Шаройкі – вотруб’е, рэшткі абалонкі змолатага ячменю.

***як дошка, парсюка*** (яскравае параўнанне), які таксама хоча есці, азірае вясковы падворак, трухлявы ніжні вянок хаты, з якога абірае мох, лезе на вышкі па яйкі, падае наніз, ледзь не пабіўшыся.

Другая лінія сюжэта – паводзіны малога, які адбег ад хаты, зашыўся ў алешнік і, пакрыўджаны, думае пра сваю бяду, будуе шалаш, адкуль хлопчыка і прыносіць у хату маці.

Трэцяя падзейная лінія звязана з маладой салдацкай удавой, якая толькі тры гады жыла за мужам. Яна працуе, не разгінаючы спіны: пасля проса дзярэ на крупы жорнамі ячмень, кліча раз-пораз сына, перажывае, што не адклікаецца і свякроў. Яе бярэ крыўда, што свёкар не такі практычны, як іншыя, – не накраў, як суседзі, калгаснага дабра, бо быў *"надта памяркоўны ды паблажлівы да людзей"*, *"толькі і паспеў узяць, што каня"* – ***Абарванчыка*** (мянушку далі людзі за тое, што ў яго некалі ваўкі вырвалі паўсцягна). Нястача і галеча непакояць яе, непакоіць і здарэнне з сынам.

Завяршаецца падзейны сюжэт апавядання прымірэннем свекрыві і Марыі: абедзве яны выплакваюць сваю вялікую бяду – страту сына і мужа, адчуваюць віну і перад малым, які, рана становячыся дарослым, умешваецца ў іх дыялог і старaецца змягчыць іх боль па-дзіцячы простымі, падаросламу разумнымі словамі: *«І ён тады кінуўся да бабулі і маці, угаворваў іх, ушчуваў:*

*– Не плачце!.. Я не буду чапаць больш хлеба... Не плачце!.. Я не баюся Зміцеравага "паліцая"... Мама, гэта я так тады плакаў, а ты не плач...*

*Было гэта на чацвёртым годзе вайны».*

Канфлікт вырашае разумны хлопчык, звязвае развязаны вузел сумеснага жыцця, сваімі простымі словамі высушвае слёзы і маці, і бабулі, зблiжае іх яшчэ больш.

Гэта толькі канфлікт падзейны, павярхоўны. З яго мы даведваемся пра горкае жыццё асірацелых людзей... Пра галоднага хлопчыка. Пра галоднага, худога, як дошка, парсюка. Пра падгнілы ніжні вянец зруба. Пра адсутнасць мужчыны-гаспадара ў доме. Пра *"спустошаны нейкі пакутліва нямы"* твар свекрыві. І ў гэтым нам таксама дапамагае апісанне прыроды, шэрай, якая не ўвабралася ў сілу: *"Была вясна, было пуставата на градах... ляжала, зламаўшыся, апаўшы на зямлю, нейкае бадыллё ад мінулага лета"*. Усё гэта сведчыць пра цяжкасць, драматызм жыцця асірацелай сялянскай сям'і.

### Героі твора. Унутраны маналог як сродак раскрыцця характараў герояў

Цяжкае жыццё прадвызначыла ў многім паводзіны і трагедыйнае светаадчуванне герояў... І старая бабуля, і маладая жанчына (яе нявестка) – працаўніцы, пакутніцы. ***Бабулю*** праца рана састарыла, пазбавіла яе радасці і страта сына. Аўтар паказвае вельмі балючыя перажыванні, раскрывае характар знясіленай горам жанчыны праз унутраны маналог. Падобным шляхам ідзе аўтар і пры раскрыцці характару яе нявесткі Марусі і ўнука. Старая перажывае, што фактычна нізавошта пакарала ўнука. Гэты ўчынак яна сабе не можа дараваць і вельмі пакутліва перажывае, што так адбылося, вінаваціць сябе, што не дадала ласкі і цяпла сыну і цяпер таго самага не можа даць унуку: *"І яна шкадавала ўнука, шкадавала, што некалі даўно адсцябала гэтак жа матузамі сына, забітага цяпер на вайне... і вось цяпер ёй балюча было ад таго, што ніколі ўжо не скажа сыну, што нізавошта пабіла яго тады..."*

Унутраны маналог старой паказвае яе як працаўніцу, справядлівага чалавека, жанчыну, за знешняй суровасцю якой хаваецца добрая душа, душа маці, якая любіць увесь свет. Упаўшы, калі збірала курыныя яйкі, з гарышча ў хляве, яна не адгукаецца, не паказвае болю, не кліча на дапамогу, каб не перашкаджаць працаваць нявестцы Марусі. А потым ёй захацелася спачування і ласкі. Старая жанчына – сімвал маці Беларусі. Яна ўсё сцерпіць. Калі трэба, будзе строгай, другім часам – лагоднай і пяшчотнай. Менавіта такой яна паўстае ў фінальнай, самай псіхалагічнай сцэне, калі дзеліцца з Марусяй агульнай бядой, аплаквае сваё і яе сіроцтва: *"Марусечка мая мілая, – не гаварыла, а шаптала, нібы дапытвалася ў некага, старая, – што ж нам цяпер рабіць без нашага Андрэйкі? За якія ж грахі асіраціў нас Бог?*

*– Не трэба, мама, не трэба... Напалохаеш малога.*

*Яны стаялі, як ніколі блізкія адна адной, падтрымлівалі адна адну за плечы і ціха плакалі – ужо не столькі ад гора, колькі ад гэтай роднасці адна адной"*.

***Нявестка Маруся*** блізкая да сваёй свекрыві і працавітасцю (яна за працаю на працягу ўсяго апавядання), і строгасцю (не бароніць сына, не дакарае старую за пакаранне). Добрая па прыродзе, яна шкадуе і сына, і свякроў, бо бачыць, як яны перажываюць: *"Яна баялася толькі, што знясілены крыўдай і плачам, не сцішыўся б дзе, не заснуў, і падумала, што скора трэба зноў выйсці, паклікаць яго. Тое, што на двары не было старой, таксама непакоіла яе"*. Не сціхае ў яе душы боль па страчаным мужы, той боль, які яна выкажа разам з свякроўю ў канцы твора ў прысутнасці свайго сыночка. Яшчэ адна рыса характару Марусі – яе празарлівасць, адчуванне несправядлівасці пасляваеннага жыцця. З трывогай прыгадвае яна, як расцягвалі калгасную маёмасць, асуджае суседа Зміцера, які адседжваўся ў вайну, служыў старастам пры немцах, потым падаўся ў партызаны, а цяпер нацягаў усялякага дабра ў дом, жыве і не бядуе пры поўнай хаце. Маладая жанчына думае, што ў такіх умовах трэба выпрацаваць у сабе *"трыванне і жорсткасць да сябе і да людзей, каб паставіць сябе ў жыцці, каб не даць у крыўду сябе і сына"*.

Скупая на ласку, яна супакойвае сыночка, прынёсшы яго ў дом з шалаша, і той адчувае, што ў яе *"нястрашная, вялікая і добрая"* рука, сцішваецца, ляжыць *"паспакойнелы і бяздумны"*, пакуль не пачуе галашэння маці: *"А сыночак мой, а сіраціначка мая, – жалілася яна, – ніхто цябе не пашкадуе, ніхто цябе не абароніць"*.

***Малы хлопчык*** – справядлівае, надзіва рана пасталелае дзіця, якое не церпіць здзекаў, умее пастаяць за сябе (выпадак з суседскім хлопцам – сынам "паліцая" Зміцера). Аўтар перадае і яго ўнутраны маналог, калі той збег з дому, раскрывае яго амаль дарослыя мары (*«...колькі разоў пачынаў ду-*

*маць пра свае ўцёкі з вёскі... Яшчэ вось дзеда шкада, шкада, што не давядзецца пабіцца з "паліцаем".<...> Ён адчуў сябе моцным і адзінокім...»).*

Псіхалагічна паглыбленае апавяданне Міхася Стральцова складаецца з трох унутраных маналогаў герояў. Гэта праўдзівае апісанне нялёгкага жыцця людзей на чацвёртым годзе вайны.

Пытанні

1. Калі і дзе нарадзіўся Міхась Стральцоў? Да якога пісьменніцкага пакалення ён адносіцца?

2. Як называўся першы твор М. Стральцова? Што азначае сімвалічны вобраз "блакітны вецер"?

3. Якая асноўная ідэя апавядання "Сена на асфальце"? Ці выяўляецца яна ў загалоўку твора?

4. Якія рысы характарызуюць галоўнага героя? Якая яго асноўная мара?

5. Якія рысы ўласцівыя дзядзьку Ігнату?

6. У чым заключаецца асаблівасць кампазіцыі апавядання "Сена на асфальце"? Для чаго аўтар звярнуўся да формы ліста?

7. Які перыяд жыцця народа паказаны ў апавяданні "На чацвёртым годзе вайны"?

8. Як паказана ў апавяданні "На чацвёртым годзе вайны" старая? Знайдзіце ў тэксце адказ на тое, ці была яна добрай.

9. Чым падобная да свекрыві Маруся? Ці ўласцівыя ёй свае рысы?

10. Якую ролю ў апавяданні адыгрываюць унутраныя маналогі?

Заданні

1. Складзіце цытатную характарыстыку Віктара — героя апавядання "Сена на асфальце".

2. Прывядзіце прыклады трапных вобразаўтропаў з прачытаных твораў пісьменніка, раскрыйце іх ролю ў кантэксце.

3. Перакажыце сваімі словамі сюжэт апавядання "На чацвёртым годзе вайны". Што страцілася з твора ў вашым пераказе сюжэта?

4. Прачытайце і пракаментуйце адзін з вершаў М. Стральцова.

5. Перакажыце змест аднаго з крытычных артыкулаў (эсэ) пісьменніка. Пракаментуйце 1-2 цытаты з яго.

6. Пакіньце ў прыведзеным шэрагу прозвішчы пісьменнікаў — дзяцей вайны: Максім Танк, Янка Сіпакоў, Аляксей Пысін, Віктар Казько, Пімен Панчанка, Рыгор Барадулін, Янка Купала, Янка Брыль, Анатоль Вярцінскі, Іван Чыгрынаў, Іван Пташнікаў, Барыс Сачанка.

Тэмы рэфератаў

• Тэма дзяцінства ў творчасці Міхася Стральцова.

• Міхась Стральцоў — даследчык беларускай літаратуры.

• Час і людзі ў паэзіі Міхася Стральцова.

Літаратура

**Бугаёў Дз.** Шматграннасць: Літаратурна-крытычныя артыкулы. – Мінск: Маст. літ., 1970.

**Васючэнка П.** Міхась Стральцоў // Гісторыя беларускай літаратуры. XX ст. Кн. 2: 1986 – 2000. – Мінск: Бел. навука, 2003.

**Сямёнава А.** Гарачы след таленту: Літаратурна-крытычныя эцюды. – Мінск: Маст. літ., 1979.

*Паэтычны кругабег*

# Міхась СТРАЛЬЦОЎ

# *"РУШЫЛІ ЛЮДЗІ"*

**НА АЎТОБУСНАЙ СТАНЦЫІ**

*"Не забуду матку родну".*
*Шрам яшчэ вунь на шчацэ.*
*Між станцыйнага народу*
*Ён з авоськай у руцэ.*
*Словы тыя: "Не забуду" –*
*Мне у вочы, нібы дым.*
*А яму цяжэй: усюды*
*Неадлучна яны з ім.*
*Мо па дурасці, мо шчыра*
*Вывеў – горычы таўром –*
*Іх тады, як горад выраў*
*З роднай вёскі, дзе быў дом.*
*Што ж цяпер? Спацехі мала.*
*Як сабе даруе ён,*
*Што вязе ў абмен на сала*
*Мінскай выпечкі батон?*
*Што і лёс не так варожыць,*
*Што нялёгкі матчын век,*
*Што забраць яе не можа,*
*Цы і быць пры ёй не можа, —*
*І сумуе чалавек.*
*І стаіць. Блукаюць думкі,*
*Твар у ранніх змаршчаках.*
*Ну і я стаю. Ні сумкі,*
*Ні авоські ў руках.*

* * *

*Ты пайшла,*
*ты чамусьці пайшла,*
*і я*
*стаў калодзежам без вады,*
*стаў вясновым кустом без лісця,*
*але болей за ўсё*
*стаў падобны на клетку,*
*якую пакінула птушка...*

*Чую, у садзе чужым пяе,*
*бачу між дрэў залачоную клетку.*

* * *

*О як я вернасці баюся,*
*О як я вернасці жадаю!*
*Плачу даніну дзіўнай скрусе,*
*Калі табе кажу: "Кахаю!"*

*Плачу даніну дзіўнай здрадзе,*
*Што між пялёсткамі лілеі,*
*Прыдатная чужой уладзе,*
*Быць пэўнай ў пэўны час умее.*

*І ты, лілея, ты, лілея!..*
*Спякотны дзень трымціць бясконца.*
*Тады ўжо я паразумнею,*
*Калі цябе сасмажыць сонца!..*